**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**
**Філалагічны факультэт**
**Кафедра сучаснай беларускай мовы**

**Анатацыя да дыпломнай работы**
**Клімянок Жанны Юр'еўны**

# "Лексіка-семантычная спалучальнасць прыметніка ў аспекце "слоўнік-кантэкст"

**Навуковы кіраўнік Важнік Сяргей Аляксандравіч**

**2014**

## РЭФЕРАТ

**Структура:** праца складае 42 с. (2 гл., 40 крыніц)

**Ключавыя словы:** ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНАЯ СПАЛУЧАЛЬНАСЦЬ, СІНТАГМАТЫЧНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ, КАМБІНАТОРНЫ СЛОЎНІК, КАНСТРУКЦЫЯ «ПРЫМЕТНІК + НАЗОЎНІК», КАНТЭКСТУАЛЬНА-СЛОЎНІКАВЫ АСПЕКТ, АБМЕЖАВАНАЯ (ВУЗКАЯ) І СВАБОДНАЯ (ШЫРОКАЯ) СПАЛУЧАЛЬНАСЦЬ

**Аб'ектам** навуковага даследавання з'яўляецца лексіка-семантычная спалучальнасць беларускага прыметніка.

**Асноўная мэта** навуковай працы – апісанне спецыфікі сінтагматычных адносін беларускага прыметніка ў кантэкстуальна-слоўнікавым аспекце, выяўленне заканамернасцей змянення кола слоўных атачэнняў прыметніка ў залежнасці ад дыскурсіўнага ўжывання, а таксама распрацоўка методыкі складання слоўніка спалучальнасці прыметніка ў беларускай мове. Для дасягнення пастаўленай мэты былі выкарыстаны наступныя **метады**: апісальны, квантатыўны, параўнальна-супастаўляльны (кантрастыўны), кампанентны аналіз значэння.

У працэсе даследавання былі вызначаны спосабы адлюстравання спалучальнасных уласцівасцей прыметніка ў беларускіх слоўніках, зарэгістраваны пэўныя змены ў сінтагматыцы атрыбутыўных канструкцый у мастацкім тэксце і спартыўным дыскурсе, складзены алгарытм адбору лінгвістычнага матэрыялу ў слоўнік спалучальнасці прыметніка ў беларускай мове.

**Вынікі** даследавання могуць быць выкарыстаныя ў беларускай лексікаграфіі (вучэбных і спецыяльных слоўніках) і тэарэтычных курсах (па сінтаксісе, лексікалогіі, лексікаграфіі, фразеалогіі). Даследаванне ўяўляе цікавасць для методыкі выкладання беларускай мовы ў іншамоўнай аўдыторыі. Практычным вынікам працы можа стаць стварэнне ў перспектыве слоўніка спалучальнасці прыметніка ў беларускай мове.

## ABSTRACT

**Structure and scope of the diploma work:** The diploma work consists of: diploma work assignment, table of contents, diploma work summary, introduction, 2 chapters, conclusion, the list of references which includes 40 positions.

Total scope of work is 42 pages.

**Keywords:** LEXICO-SEMANTIC COMPATIBILITY, SYNTAGMATIC OPPORTUNITIES, COMBINATORY DICTIONARY, CONTEXTUAL and VOCABULARY ASPECT, CONSTRUCTION «ADJECTIVE + NOUN», LIMITED (NARROW) AND FREE (WIDE) COMPATIBILITY

**The object of scientific research** is lexico-semantic compatibility of Belarusian adjective.

**The main purpose of scientific work** is the description of the specifics of syntagmatic relations of Belarusian adjective in contextual dictionary aspect, the regularity of changes of the circle verbal environments adjective depending on discursive use and development of methodology of compiling the dictionary the compatibility of an adjective in the Belarusian language.

**Methods:** method of comparative analysis, method of quantitative analysis, descriptive analysis method, component analysis.

During research were identified ways to reflect compatibility properties adjective in Belarusian dictionaries, registered some changes in syntagmatic attribute structures in fiction and sports discourse, was developed algorithm of selection of language material for combinatory dictionary of adjective in the Belarusian language.

The **results** of the research can be used in the Belarusian lexicography (educational and special dictionaries) and theoretical courses (syntax, lexicology, lexicography, phraseology). The study is of interest for the teaching of the Belarusian language in a foreign language audience. The practical result of the work may be creation in perspective of the combinatory dictionary of adjective in the Belarusian language.